Являясь президентом Библиотечной Ассамблеи Евразии, которым он был избран в 2007 г., Р.С. Мотульский способствует консолидации усилий библиотек Содружества для осуществления крупных совместных проектов по сохранению национального книжного достояния, развития профессиональных контактов и решения общих актуальных проблем современных библиотек. Он – активный участник гуманитарных форумов и конференций, организуемых в рамках СНГ и за его пределами.

Роман Степанович Мотульский – человек большой эрудиции, библиотекарь и педагог по образованию и призванию. Он обладает высоким научным потенциалом и необыкновенной работоспособностью. Чувство ответственности, стремление направить все свои усилия на обеспечение стабильной работы возглавляемого им коллектива, неординарные организаторские качества отвечают требованиям времени и содействуют развитию Национальной библиотеки Беларуси как важного элемента информационной структуры государства.

[1] Впереди еще много вершин: к юбилею Р.С. Мотульского // Вестник Библиотечной Ассамблеи Евразии. 2011. № 3. С. 38–40.

[2] Дзямешка Л. У студэнцкім жыцці – вялікая падзея // Бібліятэчны свет. 2004. № 4. С. 31–32.

[3] Бондарь Ю.П. Научные школы БГУКИ и решение задач научного обеспечения сферы культуры Республики Беларусь // Весн. Беларус. дзярж. ун-та культуры і мастацтваў. 2014. № 2. С. 5–10.

[4] Впереди еще много вершин …

*В.А. Касап, В.І. Саітава, М.А. Яцэвіч*

## Вучоны і арганізатар падрыхтоўкі бібліятэчных кадраў у Рэспубліцы Беларусь (да 80-годдзя В.Е. Лявончыкава)

Прааналізаваны ўклад прафесара, доктара навук В.Е. Лявончыкава ў падрыхтоўку бібліятэчных кадраў і бібліятэчную навуку на падставе гістарычнага і дзейснага падыходаў

*V.A. Kasap, V.I. Saitava, M.A. Yatsevich*

## Scientist and organizer for library personnel in the Republic of Belarus (on the occasion of the 80th anniversary of V.E. Lyavonchykau)

The article deals with the contribution of the Professor, Doctor of Sciences V.E. Lyavonchykau to the training of library staff and library science on the basis of historical and system approaches

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

В.Е. Лявончыкаў, выдатны вучоны і педагог, нарадзіўся 27 мая 1937 года ў г. Бярозаўка Слаўгарадскага раёна Магілёўскай вобласці. З бібліятэчнай справай яго лёс звязаны з 1950-х гадоў, калі некаторы час працаваў адборшчыкам літаратуры ў аблкнігагандлі горада Мінска, загадчыкам бібліятэкі вайсковай часткі. У 1962 годзе скончыў бібліятэчны факультэт Мінскага педагагічнага інстытута імя М. Горкага.

У гэты ж час пачалася і педагагічная дзейнасць В.Е. Лявончыкава на бібліятэчным факультэце, дзе ён выкладаў шмат дысцыплін бібліяграфічнага цыклу. Працаваў спачатку ў якасці выкладчыка, з 1964 г. – старшага выкладчыка і намесніка дэкана бібліятэчнага факультэта, а з 1971 г. – дацэнта кафедры бібліяграфіі, дэкана бібліятэчнага факультэта. Васіль Емельянавіч быў адным з арганізатараў будаўніцтва Мінскага інстытута культуры, узначальваў адпаведны штаб будаўніцтва, а з адкрыццём у 1975 г. Мінскага інстытута культуры быў прызначаны на пасаду дэкана бібліятэчнага факультэта. У гэты перыяд праявіўся талент В.Е. Лявончыкава як арганізатара і кіраўніка бібліятэчнай адукацыі рэспублікі. Ён запрашае з Расіі кандыдатаў навук Т.А. Каралёву, І.У. Мельнік, Э.С. Суддзю, А.І. Усціменка, В.А.Факеева, Н.В. Хахлову, якія пачалі выкладанне спецыяльных прадметаў студэнтам бібліятэчнага факультэта і ўключыліся ў навукова-даследчую працу. Высокі навуковы патэнцыял і вопыт навукова-педагагічнай дзейнасці дазволілі Васілю Емельянавічу стаць адным з заснавальнікаў факультэта інфармацыйна-дакументных камунікацый. З 1983 г. Васіль Емельянавіч абіраецца прафесарам кафедры бібліяграфіі і яе загадчыкам. Падчас працы ва ўніверсітэце В.Е. Лявончыкаў узначальваў кафедры бібліяграфіі, бібліяграфіі і дакументазнаўства, тэорыі і гісторыі інфармацыйна-дакументных камунікацый больш за 26 гадоў. Яго агульны педагагічны стаж складае звыш 50 гадоў.

В.Е. Лявончыкаў падрыхтаваў некалькі пакаленняў бібліятэчных спецыялістаў, якія плённа працуюць у розных бібліятэках Рэспублікі Беларусь, а таксама ў краінах Заходняй Еўропы, Афрыкі, Азіі, многіх краінах СНД.

Ён ініцыятар новых кірункаў падрыхтоўкі бібліятэчных кадраў: «бібліятэчна-бібліяграфічнае краязнаўства», «навукова-метадычная дзейнасць бібліятэк», «рэдкая і старадрукаваная кніга» і іншых. Выказаў прапанову аб падрыхтоўцы бібліятэчных кадраў са скарочаным тэрмінам навучання для асоб, якія маюць сярэднюю бібліятэчную адукацыю.

Васіль Емельянавіч надае вялікую ўвагу падрыхтоўцы навукова-педагагічных кадраў. Ён сам першым у Беларусі абараніў кандыдацкую дысертацыю ў галіне бібліяграфазнаўства і стаў першым доктарам навук у гэтай сферы. Быў адным з арганізатараў стварэння аспірантуры ў БДУКМ, абіраўся старшынёй і намеснікам старшыні спецыялізаваных саветаў па абароне кандыдацкіх і доктарскіх дысертацый. Пад яго непасрэдным навуковым кіраўніцтвам былі абаронены шэсць кандыдацкіх дысертацый:



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

В.І. Саітавай (прафесар БДУКМ); Т.В. Кузьмініч (намеснік дырэктара Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі, дацэнт); І.У. Дрыгі (намеснік міністра культуры Рэспублікі Беларусь); А.В. Прадзеінай (дацэнт Інстытута павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі кадраў БДУКМ); грамадзянінам Сірыйскай Арабскай Рэспублікі Ібрагімам Бадарханам (дацэнт Курдскага ўніверсітэта, Ірак); Ж.Л. Раманавай (загадчык кафедры БДУКМ).

Васіль Емельянавіч выдатны вучоны, навуковыя ідэі якога сталі пачаткам новых кірункаў даследаванняў у бібліятэчна-інфармацыйнай сферы: рэгіянальнае бібліяграфазнаўства, фарміраванне інфармацыйнай культуры карыстальнікаў бібліятэк, інфармацыйныя рэсурсы ў дзейнасці бібліятэк, інфармацыйная бяспека карыстальніка, бібліятэка ў сацыяльна-культурных камунікацыях, у сістэме бесперапыннай адукацыі і інш.

Яго даследаванні заўжды накіраваны на асэнсаванне трансфармацыі бібліяграфіі і бібліятэчнай справы ў адпаведнасці з патрэбнасцямі грамадства. Адметныя рысы ўсіх яго прац – грунтоўнасць метадалагічнай і фактаграфічнай асновы, дакладнасць даследчых мэтаў і сістэмы навуковай аргументацыі, тэарэтычная і практычная навізна і значнасць.

Кола навуковых інтарэсаў В.Е. Лявончыкава вельмі шырокае. Гэта тэарэтыка-метадалагічныя праблемы бібліяграфазнаўства і бібліятэказнаўства, гісторыя беларускай бібліяграфіі, пытанні бібліятэчнай адукацыі, інфармацыйнай культуры, тэорыі інфармацыі і камунікацый і інш.

У тэарэтыка-метадалагічных даследаваннях на аснове сістэмнага падыходу ён упершыню абгрунтаваў прынцып дыферэнцыяцыі інфармацыйных патрэбаў рэгіёну на агульныя і спецыфічныя, што дазволіла ўдакладніць іх структуру, даследаваць сутнасць паняццяў «інфармацыйныя патрэбнасці рэгіёну» і «рэгіянальныя інфармацыйныя патрэбы».

Вынікам распрацоўкі тэрміналогіі у галіне бібліяграфіі, бібліятэчнай справы і кнігазнаўства сталі выдадзеныя ўпершыню ў Беларусі «Руска-беларускі слоўнік бібліятэчных і бібліяграфічных тэрмінаў» (у сааўтарстве з Л.А. Дзямешка) і «Тлумачальны слоўнік бібліятэчных і бібліяграфічных тэрмінаў» (у сааўтарстве з Л.А. Дзямешка і Р.І. Саматыя). Апошні атрымаў першую прэмію Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь у конкурсе на лепшую работу ў галіне бібліятэчнай справы.

Ён удакладніў паняцце «бібліятэчная камунікацыя» як разнавіднасць сацыяльнай камунікацыі, якая ажыццяўляецца ў бібліятэчнай прасторы і накіравана на ўзаемадзеянне бібліятэкараў паміж сабой і з карыстальнікамі з мэтай абмену данымі, інфармацыяй і ведамі аб дакументных патоках і масівах, а таксама распаўсюджвання жыццёвых (бытавых), вытворчых і навуковых ведаў аб навакольным знешнім свеце.

Асобнае месца ў даследаваннях В.Е. Лявончыкава займае гісторыя беларускай бібліяграфіі. Ён з’яўляецца заснавальнікам гэтага навуковага кірунку. У выдадзеных падручніках «Беларуская бібліяграфія. Агульны курс» (1981 г., 1991 г.), вучэбным дапаможніку «Бібліяграфазнаўства.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Гісторыя» (у сааўтарстве, 2017 г.) і артыкулах адлюстравана ўзнікненне і развіццё айчыннай бібліяграфіі з часоў Вялікага Княства Літоўскага да нашага часу.

Чырвоная нітка яго навуковай творчасці – служэнне нацыянальным прыярытэтам кніжнай і бібліятэчнай справы, бібліяграфіі. Разам з вядомымі дзеячамі беларускай бібліятэчнай справы, бібліяграфіі і кніжнай справы (Г.Я Галенчанкам, Я.С. Умецкай, А.В. Мураўёвай, Р.М. Чыгіровай, Т.В. Рошчынай, Т.В. Кузьмініч, Л.І. Доўнар і інш.). В.Е. Лявончыкаў актыўна ўдзельнічаў ў тэарэтычным даследаванні паняццяў «беларуская кніга» і «нацыянальны дакумент». Яго тэарэтычныя абгрунтаванні, сугучныя перадавым міравым падыходам, садзейнічалі дасягненню больш поўнага і якаснага адлюстравання бягучай і рэтраспектыўнай частак нацыянальнага дакументнага потоку (уключаючы і дакументы экстэрыёрыкі) у фондах буйнейшых айчынных бібліятэк і інфармацыйна-пошукаваных сістэмах[1].

В.Е. Лявончыкаў стварыў навуковую школу ў галіне бібліяграфазнаўства, бібліятэказнаўства і кнігазнаўства, прадстаўнікі якой працуюць у Міністэрстве культуры Рэспублікі Беларусь, БДУКМ, Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі, Нацыянальнай книжнай палаце, рэспубліканскіх галіновых, абласных, раённых, гарадскіх бібліятэках[2].

Васіль Емельянавіч з’яўляецца членам рэдкалегіі зборніка «Бібліятэчны веснік», часопіса «Веснік БДУ культуры і мастацтваў». Шмат гадоў быў намеснікам і галоўным рэдактарам міжведамаснага зборніка «Пытанні бібліяграфазнаўства і бібліятэказнаўства», прэзідэнтам Беларускай бібліятэчнай асацыяцыі. У 1993 г. ён стаў акадэмікам Міжнароднай Акадэміі інфарматызацыі пры ААН (г. Масква), з 1995 г. з’яўляецца членам-карэспандэнтам Беларускай акадэміі адукацыі. Яго імя ўключана ў слоўнік «2000 Outstanding Scientists of the 21st Century» (Cambridge, 2005) Міжнароднага біяграфічнага цэнтра ў Кэмбрыджы і ў даведнік «Кто есть кто на академическом Олимпе» (Москва, 2004) Міжнароднай Акадэміі інфарматызацыі пры ААН[3].

Падрыхтоўка бібліятэчных кадраў, стварэнне навуковай школы ў галіне бібліятэказнаўства, бібліяграфазнаўства і кнігазнаўства – гэта важныя сацыяльныя задачы, ля вытокаў якіх стаяў В.Е. Лявончыкаў – мэтанакіраваны і настойлівы кіраўнік, вядомы ў свеце вучоны, адказны і патрабавальны да сябе і калег, настаўнік усёй беларускай прафесійнай супольнасці.

[1] Касап В.А., Саитова В.И. Ученый, педагог, организатор // Библиография. 2012. № 3. С. 125–127.

[2] Яцэвіч М.А. Навукова-педагагічная школа ў галіне бібліятэказнаўства, біліяграфазнаўства і кнігазнаўства (да 20-годдзя стварэння) // Веснік БДУ культуры і мастацтваў. 2015. №2. С. 157–164.

[3] Касап В.А., Саитова В.И. Ученый, педагог, организатор …

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ